Литература и источники

1. Галубовіч, В. У. Р. Мяніцкі — даследчык гісторыі Віцебскага цэнтральнага архіва старажытных актаў / В. У. Галубовіч // 90 гадоў Віцебскай вучонай архіўнай камісіі. Матэрыялы навук. канф. 24 лістап. 1999 г., Віцебск. — Мінск: БелНДІДАС, 2000. — С. 52—55.
2. Жумар, С. У. Мяніцкі Рычард Вікенцьевіч / С. У. Жумар, М. Ф. Шумейка // Архівісты Беларусі: Біябібліягр. даведнік. — Мінск: БелНДІДАС, 2006. — С. 164—165.
3. Жумарь, С. В. Очерки истории архивного дела в Беларуси (XV в. — 1991 г.) / С. В. Жумарь, Д. В. Карев, М. Ф. Шумейко. — Минск: БелНИИДАД, 1999. — С. 17—18.
4. Іванова, В. Асабістыя архівы Беларусі канца XVIII — пач. XXI ст. — Мінск: Выдавец Змiцер Колас, 2014. — С. 286 (О Р. Меницком).
5. Из истории архивов в Беларуси (1860-е гг.—1960 г.): документы и материалы / Сост. С. В. Жумарь, М. Ф. Шумейко. — Минск: БелНИИДАД, 2015. — С. 199, 403 (О Р. Меницком).
6. Миловидов, А. И. Прошлое и современное положеиие археографии в Северо-Западном крае / А. И. Миловидов // Журнал Министерства народного просвещения. — 1904. — Ч. 360. — № 9. — С. 1—20.
7. Хоронжичевски, В. Рышард Меницкий — исследователь белорусских архивов / В. Хоронжичевски, Р. Деген // Историческое наследие Беларуси: выявление, сохранение и изучение: материалы Междуиар. науч. конф., посвящ. 90-летию Гос. арх. службы Респ. Беларусь, 85-летию Нац. архива Респ. Беларусь и 20-летию кафедры источниковедения БГУ (г. Минск, 17—18 мая 2012 г.): В 2 ч. — Ч. 2. — Минск: БелНИИДАД, 2013. — С. 161—173.
8. Mienicki, R. Archiwum akt dawnych w Witebsku / R. Mienicki. — Warszawa, 1939.
9. Mienicki, R. Wilenska Komisja Archeograficzna / R. Mienicki. — Warszawa, 1925.
10. Ryszard Mienicki (1886—1956). Archiwista i Historyk / Pod redakcja W. Chorazyczewskiego i R. Degena. — Torun: Wydawnictwo naukowe Uniwersytetu Mikolaja Kopernika, 2009. — 129 s.
11. Tomczak, A. Mienicki Ryszard / A. Tomczak // Polski Slownik Biograficzny. — Warszawa. 1975. — T. XX. — S. 800—801.

—◊—

*Э. Р. Іофе*

## ЗІНОВІЙ КАПЫСКІ ЯК КРЫНІЦАЗНАЎЦА І АРХЕОГРАФ

*(19 студзеня 2016 г. — 100-годдзе беларускага вучонага-гісторыка)*

У беларускай гістарыяграфіі Зіновій Капыскі разглядаецца перш за ўсё як таленавіты гісторык беларускіх гарадоў другой паловы XVI — XVII стагоддзяў. Па-другое, яго ацэньваюць як маштабнага гістарыёграфа.

Па-за ўвагай даследчыкаў застаецца навуковая спадчына З. Ю. Капыскага як крыніцазнаўца і археографа.

Калі прааналізаваць навуковую спадчыну беларускіх вучоных у галіне крыніцазнаўства Беларусі эпохі Сярэднявечча, то З. Ю. Капыскі, безумоўна, быў адным з самых таленавітых, арыгінальных, скрупулезных і аб'ектыўных гісторыкаў.

Па ступені ведання гістарычных крыніц побач з Зіновіем Юльевічам Капыскім можна паставіць і Мікалая Мікалаевіча Улашчыка, Дзмітрыя Леанідавіча Пахілевіча, Паўла Рыгоравіча Казлоўскага, Анатоля Пятровіча Грыцкевіча і Георгія Якаўлевіча Галенчанка. Шчыра кажучы, ён быў адным з самых здольных і верагодных крыніцазнаўцаў Бела-

русі і археографаў. З навуковай спадчыны Капыскага па гэтай праблеме я хацеў бы выдзеліць яго манаграфію «Источниковедение аграрной истории Белоруссии» (Минск, 1978), артыкулы «Новыя дакументы аб Крычаўскім паўстанні (1740—1744 гг.) (сумесна з В. Лайко) (1953), «Першая навуковая публікацыя Статута 1529 г.» (сумесна з В. У. Чапко) (1960), «Сборники документов по истории Белоруссии, изданные в БССР (1921—1971)» [1, с. 13—23], «Беларуска-літоўскія летапісы XV — XVI стст. як помнікі гістарычнай думкі» [2].

У кнізе З. Ю. Капыскага «Источниковедение аграрной истории Белоруссии» зроблены крыніцазнаўчы аналіз дакументаў XVI — першай паловы XVII ст., што захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (тады — Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў БССР). Прадметам разгляду сталі інвентары і рэестры ўладанняў, дакументы ўліку грашовых сродкаў і крэдытных аперацый феадалаў (дакументы ўліку грашовых прыбыткаў і расходаў, падатковыя дакументы, даўгавая дакументацыя), дакументы аб сялянах, асабліва аб іх становішчы і барацьбе.

Гэта манаграфія знаёміць чытача са складаным комплексам пісьмовых крыніц, у большасці сваім неапублікаваных. Яна ўтрымлівае align разнабаковую крыніцазнаўчую характарыстыку дакументаў, аб'яднаных па тэматычных і відавых прыметах. Галоўная ўвага ўдзелена тым даным, якія дазваляюць глыбей раскрыць сутнасць і асаблівасці феадальнага грамадства ў Беларусі XVI — першай паловы XVII ст.

Шэраг цікавых і важных назіранняў дае аналіз дакументаў аб становішчы і антыфеадальных выступленнях беларускага сялянства. З. Ю. Капыскаму ўдалося паказаць формы і метады супраціўлення сялянства прыгонніцкаму гнёту.

Ва ўводзінах да «Источниковедения аграрной истории Белоруссии» ёсць такія радкі: *«В определении целей и задач настоящей работы мы полностью разделяем мнение советского исследователя Н. Г. Бережкова: "... источниковедческая работа, не питаемая и направляемая во всех своих стадиях интересами использования памятника как исторического источника — это нелепость, не требующая опровержения"»* [3, с. 4].

Зіновий Юльевіч Капыскі быў вучоным-гісторыкам найвялікшай эрудыцыі, якая далёка выходзіла за вывучэнне гісторыі Беларусі эпох феадалізму і капіталізму. Бясспрэчным з'яўляецца ўклад вучонага ў развіццё археаграфіі ў Беларусі. Аб гэтым сведчыць аналіз першага тома зборніка дакументаў і матэрыялаў «Белоруссия в эпоху феодализма», складзенага З. Ю. Капыскім і М. Ф. Залогай і ахапіўшага перыяд са старажытных часоў да сярэдзіны XVII ст. (Мінск, 1959), другога тома, складзенага А. И. Азаравым, А. М. Карпачовым, З. Ю. Капыскім, Т. В. Камаровай і ахапіўшага перыяд з сярэдзіны XVI да канца XVII ст. (Мінск, 1960). Разам з іншымі крыніцазнаўцамі ён стаў складальнікам першага зборніка дакументаў і матэрыялаў «Социально-политическая борьба народных масс Белоруссии. Конец XIV — 1648 г.» (Минск, 1960). Да цяперашняга часу не страціла сваёй навуковай каштоўнасці кніга Я. М. Зуева і З. Ю. Капыскага «Хрестоматия по истории БССР». Ч. I, якая выйшла ў свет 55 гадоў таму назад — у 1961 годзе.

Вучонага можна назваць «рыцарам археаграфіі». Аднойчы з горыччу ён прызнаўся аўтару гэтых радкоў:

«Я вельмі перажываю, што ў нашай рэспубліцы ў дрэнным стане знаходзіцца археаграфія. Але без яе мы ніколі не зможам раскрыць сапраўдную гісторыю беларускага народа на ўсіх этапах яго развіцця».

Неаднаразова я быў сведкам таго, як на навуковых канферэнцыях многія навукоўцы адзначалі арыгінальнасць артыкула Зіновія Юльевіча «Сборники документов по истории

Белоруссии, изданные в БССР (1921—1971 гг.)», апублікаванага ў 1975 г. у Маскве. З болю ў сэрцы ён канстатаваў:

*«... Значительная часть сборников лишена главного признака — максимальной полноты документов и материалов по избранной теме.*

*Опубликованные сборники научного типа отражают сравнительно узкий круг вопросов истории Белоруссии. Так, в эпохе феодализма внимание составителей сборников было сконцентрировано на вопросах экономики, в эпохе капитализма — на рабочем движении и революционных событиях в целом, в советском периоде — на политической истории первых лет развития советского общества и государства...*

*Накопленный опыт позволяет достигнуть более высокого уровня изданий. Для феодальной эпохи первостепенное значение имеет освещение социальной структуры общества, всесторонняя характеристика аграрных отношений, политической истории, классовой борьбы. Особый интерес представляет такое собрание источников, которое позволило бы проследить развитие того или иного явления в динамике. Например, характерные черты развития феодального хозяйства и феодальных отношений, рыночных связей за длительный период. Такую же возможность предоставил бы сборник цеховых уставов для изучения эволюции ремесленного производства и социально-экономического развития города в эпоху феодализма... По всем периодам истории Белоруссии необходимы сборники демографических документов и материалов»* [1, с. 22—23].

Яго жыццёвы шлях пачаўся ў разгар Першай сусветнай вайны.

Але спачатку ўспомнім біяграфічныя звесткі аб гэтым вучоным. Нарадзіўся З. Ю. Капыскі 19 студзеня 1916 г. у адным са старажытнейшых гарадоў Беларусі — Віцебску. У 1932 г. Зіновій Капыскі скончыў сямігодку і паступіў у ФЗУ пры Віцебскім заводзе «Чырвоны металіст». Затым ён стаў працаваць токарам на гэтым заводзе, а ў верасні 1934 г. стаў студэнтам 4-га курса рабфака. Здольны юнак цягнецца да ведаў і ў верасні 1935 г. паступае вучыцца на планава-эканамічнае аддзяленне Мінскага інстытута народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава, які скончыў у 1939 г. па спецыяльнасці «эканаміст-планавік». Менавіта з таго часу ў Зіновія Капыскага з'явілася цікавасць да эканамічных пытанняў, якая засталася і калі ён стаў вучоным-гісторыкам.

Зіновій Юльевіч працаваў старшым эканамістам у Мінскім абласным планавым аддзеле, а ў 1940 г. перайшоў у Інстытут эканомікі АН БССР. У кастрычніку 1940 г. паступіў у аспірантуру Акадэміі навук БССР па спецыяльнасці «Дыялектычны і гістарычны матэрыялізм».

Вялікая Айчынная вайна перарвала вучобу. 26 чэрвеня 1941 г. Зіновій Капыскі эвакуіраваўся з Мінска ў Смаленск, а затым у Вязьму, дзе быў мабілізаваны ў Чырвоную Армію.

З чэрвеня па лістапад 1941 г. Зіновій Юльевіч служыў радавым 123-га, а затым 206-га запаснога палка на Заходнім фронце. У лістападзе 1941 г. Капыскі быў ранены і знаходзіўся на лячэнні ў шпіталі. У гэтым шпіталі ён быў пераведзены на пасаду загадчыка справаводства, а з лютага 1943 г. быў накіраваны на пасаду медыцынскага статыстыка санітарнага аддзела 5-й арміі, а ў ліпені 1943 г. прызначаны памочнікам камандзіра асобнай роты медыцынскага ўзмацнення № 15 пры 5-й арміі 2-га Украінскага фронта. У студзені 1944 г. рота была перададзена з Санітарнага аддзела 5-й арміі ў Санупраўленне 2-га Украінскага фронта з заменай № 15 на № 97. У складзе роты Капыскі быў у Румыніі — з ліпеня па кастрычнік 1944 г., у Венгрыі — з лістапада 1944 па чэрвень 1945 г. і ў Чэхаславакіі — з чэрвеня да 7 жніўня 1945 г. У канцы жніўня рота медыцынскага ўзмацнення, дзе служыў Зіновій Юльевіч, была пераведзена ў Адэсу і там расфарміравана

За актыўны ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне ён быў узнагароджаны медалямі «За абарону Масквы», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.». Апошняе воінскае званне З. Ю. Капыскага — старшы лейтэнант.

Пасля дэмабілізацыі Капыскі вярнуўся ў Мінск і працягваў вучобу ў аспірантуры Інстытута гісторыі АН БССР па спецыяльнасці «ўсеагульная гісторыя», якую скончыў у 1948 г. У гады вучобы ў аспірантуры і пасля яе заканчэння ён вёў выкладчыцкую работу ў Мінскім педагагічным інстытуце імя А. М. Горкага і Рэспубліканскай партыйнай школе пры ЦК КП(б)Б (да 1950 г.).

У студзені 1950 г. Зіновій Юльевіч стаў малодшым навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі АН БССР.

Перад намі цікавы дакумент. Прыводзём яго тэкст:

*«ВЫПИСКА*

*ИЗ ПРИКАЗА № 1 ПО ИНСТИТУТУ ИСТОРИИ АН БССР*

*"6" января 1950 г.* *гор. Минск*

*Зачислить на работу в Сектор истории СССР и БССР Института истории АН БССР на должность младшего научного сотрудника Копысского З. Ю. с 20 января 1950 года с окладом 830 рублей в месяц.*

*Директор Института* *Действ. чл. АН БССР*
*истории АН БССР* *Н. М. Никольский)»* [4, л. 9].

У лістападзе 1953 г. ён абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Грамадска-палітычныя погляды Себасцьяна Франка». 31 сакавіка 1954 г. ВАК СССР зацвердзіў рашэнне вучонага савета Інстытута гісторыі АН БССР аб прысваенні З. Ю. Капыскаму вучонай ступені кандыдата гістарычных навук, а ў 1955 г. ён быў зацверджаны ў навуковым званні старшага навуковага супрацоўніка.

Палову свайго жыцця — 40 год — з 1950 па 1990 г. З. Ю. Капыскі прапрацаваў у Інстытуце гісторыі Акадэміі навук БССР — малодшым навуковым супрацоўнікам, старшым навуковым супрацоўнікам (з сакавіка 1954 г.), старшым навуковым супрацоўнікам-кансультантам (з 10 снежня 1979 г.), вядучым навуковым супрацоўнікам-кансультантам (з 7 лютага па 30 чэрвеня 1990 г.), а ў 1968—1969 гг. — выконваючым абавязкі загадчыка сектара крыніцазнаўства і дапаможных гістарычных дысцыплін. Гэты сектар быў створаны 10 снежня 1968 г. [5, с. 592].

Прыводзём «ВЫПІСКУ З ЗАГАДА № 266 ПА ІНСТЫТУТУ ГІСТОРЫІ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСКАЙ ССР ад 10 снежня 1968 г.»:

«Дальнейшее развитие белорусской исторической науки настоятельно требует развертывания исследования в области источниковедения, историографии, демографии, археографии, палеографии и ряда других вспомогательных дисциплин. До настоящего времени в республике исследовательская работа в этих областях по существу не велась, что отрицательно сказывается на уровне научной разработки проблем истории Белоруссии.

В связи с этим на основании решения отделения общественных наук от 27 ноября 1968 г. создать в Институте истории АН БССР сектор вспомогательных исторических дисциплин в составе:

1.Копысский З. Ю. — ст. науч. сотрудник, доктор ист. наук
2.Щербаков С. А. — ст. науч. сотрудник, канд. ист. наук
3.Абезгауз З. Е. — ст. науч. сотрудник, канд. ист. наук
4.Спиридонов М. Ф. — мл. науч. сотрудник
5.Голубович В. П. — мл. науч. сотрудник

6.Крэканэ М. Г. — мл. науч. сотрудник

7.Старостина В. К. — мл. науч. сотрудник

8.Кнатько Г. Д. — ст. лаборант

9.Угольникова С. П. — ст. лаборант

10.Сержанина Э. В. — аспирантка-очница первого года обучения.

Временно исполняющим обязанности заведующего сектором назначить доктора исторических наук Копысского З. Ю.

Директор Института истории АН БССР Н. В. Каменская

(Член-корр. АН БССР)» [4, л. 17]

Ужо ў салідным узросце — у 52 гады Капыскі быў удастоены вучонай ступені доктара гістарычных навук. Практычна ўсё жыццё Зіновія Юльевіча было звязана з акадэмічным Інстытутам гісторыі.

І калі сказаць шчыра, мала ў каго з беларускіх вучоных гісторыкаў быў такі высокі навуковы аўтарытэт, як у Зіновія Юльевіча Капыскага. Яго глыбокія артыкулы і кнігі ў рэспубліканскіх, саюзных і замежных выданнях выклікалі вялікі інтарэс і рэзананс.

У кожнага вучонага ёсць асноўныя, вызначальныя працы. Менавіта такой навуковай працай не толькі ў навуковай біяграфіі Капыскага, але і для ўсёй беларускай гістарычнай навукі стала манаграфія «Эканамічнае развіццё гарадоў Беларусі ў XVI — першай палове XVII ст.», якая выйшла ў Мінску ў 1966 г.

У гэтай кнізе знайшлі адлюстраванне такія ключавыя пытанні, як агульная характарыстыка гарадоў (колькасць гарадоў, іх структура і геаграфічнае размяшчэнне, гарадское насельніцтва, структура гарадскога насельніцтва), горад і сельская гаспадарка (земляробчыя заняткі грамадзян, гандлёвыя сувязі горада з сельскай гаспадаркай), рамесная вытворчасць у гарадах Беларусі (структура і характар гарадскога рамяства, цэхавыя арганізацыі, пракапіталістычныя тэндэнцыі ў гарадскім рамястве, гандаль і гандлёвыя сувязі гарадоў, унутраны гандаль, знешнія гандлёвыя сувязі гарадоў Беларусі, гандлёвыя сувязі гарадоў Беларусі з гарадамі Польшчы).

Прынцыпова важным вынікам гэтага даследавання вучонага стаў доказ вядучай ролі беларускіх гарадоў у фарміраванні ўнутранага рынку, раскрыццё сувязі купецкага капіталу з гарадскім рамяством.

Па падліках З. Ю. Капыскага ў XVI — першай палове XVII ст. у буйных гарадах налічвалася да 80 рамесніцкіх спецыяльнасцей. У сярэдніх — ад 40 да 60, у невялікіх — да 30. Згодна з яго данымі, у гэты час у дзяржаўных гарадах усяго налічвалася каля 200 рамесніцкіх спецыяльнасцей, з якіх 41 была звязана са здабычай і апрацоўкай металаў, 27 — з апрацоўкай дрэва, 25 — са скуранай і футравай вытворчасцю, 26 — з вырабам тканін і пашывам адзення, 21 — з вырабам прадуктаў харчавання, напояў і інш. [6, с. 79—81].

Характарызуючы гэту фундаментальную працу З. Ю. Капыскага праз 30 гадоў пасля яе выдання, аўтарытэтны беларускі вучоны-гісторык А. П. Грыцкевіч адзначаў:

*«У параўнанні з папярэднімі даследаваннямі гэта манаграфія адрознівалася выкарыстаннем вялікага архіўнага матэрыялу і новым падыходам да тэмы. Аўтар манаграфіі паказаў не толькі складанае эканамічнае жыццё велікакняжацкіх (дзяржаўных) гарадоў Беларусі, галоўным чынам вялікіх, але прывёў звесткі і па іншых гарадах і нават мястэчках. Калі раней гісторыкі намагаліся паказаць пераважна гандлёвыя сувязі гарадоў Беларусі і Расіі, то аўтар манаграфіі спецыяльна выдзеліў падраздзел пра такія сувязі з гарадамі Польшчы. Менавіта на аснове гэтай кнігі ў 1968 г. была абаронена доктарская дысертацыя. З. Капыскі глыбока вывучаў гісторыю гэтага адрэзку феадальнага перыяду. У той час мы, маладзейшыя супрацоўнікі, добразычліва жартуючы, называлі гэты час*

*"Капыскім перыядам гісторыі Беларусі", аддаючы даніну глыбокім ведам вучонага»* [7, с. 194].

У процілегласць гэтым поглядам Капыскі пераканаўча даказаў, што рамяство і гандаль на беларускіх землях ужо ў першай палове XVI ст. сталі асноўнымі заняткамі гарадскога насельніцтва, а гарады ператварыліся ў цэнтры рамеснай вытворчасці і гандлю. Заслугоўвае ўвагі цікавая выснова вучонага, што «город своим существованием и развитием сдерживал рост отработочной ренты и содействовал сохранению денежной ренты» [6, с. 64].

У 1975 г. была апублікавана манаграфія З. Ю. Капыскага «Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в.». Менавіта ў гэтым выданні былі дэталёва разгледжаны гарады и гараджане (агульная характарыстыка гарадоў, прывілеі гарадам, юрыдыкі ў гарадах, катэгорыі гараджан), гарадское самакіраванне (вечавая арганізацыя гарадского самакіравання, гарадское самакіраванне на магдэбургскім праве, дзейнасць самакіравання), саслоўныя аб'яднанні гараджан (цэхавая арганізацыя, брацтвы), сацыяльна-палітычная барацьба гараджан.

Раскрываючы глыбокі ўплыў гарадоў на феадальнае грамадства, Зиновий Юльевич адзначае, што яны парушылі замкнутасць асобных раёнаў краіны і адыгралі вялікую ролю ў фарміраванні беларускай народнасці. У сувязі з гэтым З. Ю. Капыскі падкрэсліваў:

*«Как бы медленно ни проходило развитие белорусских городов, они оказали глубокое влияние на все феодальное общество Белоруссии. Сформировав городское сословие, нарушив изолированность и замкнутость отдельных территорий страны, города Белоруссии явились одной из предпосылок формирования и развития белорусской народности и ее культуры. Они подготовили почву для гуманистического и реформационного движения в Белоруссии»* [8, с. 49].

Калі мець на ўвазе даследаванні па гісторыі Беларусі эпохі феадалізму і эпохі капіталізму, то Зіновія Юльевіча ў свой час па праву лічылі «гістарыёграфам № 1». Аб гэтым сведчыць яго артыкул «Гістарычная навука за 40 год» (сумесна з В. М. Перцавым, І. С. Краўчанка) (Мінск, 1958), кароткі нарыс «Дасягненні гістарычнай навукі за 50 год (1919—1969) (Мінск, 1970), вучэбны дапаможнік «Гістарыяграфія БССР (эпоха феадалізму)» (сумесна з В. У. Чапко) (Мінск, 1986). Артыкул «В. І. Пічэта аб феадальным грамадстве ў Беларусі XV—XVI стст.» (сумесна з М. Ф. Спірыдонавым), фундаментальны артыкул «Белоруссия феодального периода в советской историографии 20-х годов» [9, с. 60—65].

Нягледзячы на тое што пасля выхаду вучэбнага дапаможніка «Гістарыяграфія БССР» прайшло ўжо 30 гадоў, ён не страціў сваёй навуковай каштоўнасці і актуальнасці. Напісаны для студэнтаў гісторыкаў і настаўнікаў сярэдніх школ, дапаможнік асвятляе метадалогію і методыку даследаванняў як дарэвалюцыйнай, так і савецкай гістарычнай навукі па пытаннях гісторыі сялянства і аграрных адносін, класавай барацьбы, эканамічнага і сацыяльна-палітычнага развіцця феадальных гарадоў, нацыянальна-вызваленчага і грамадска-палітычнага руху.

Прадметам даследавання ў гэтым выданні сталі беларуская гістарыяграфія дасавецкага перыяду (беларускія летапісы XV—XVIII стст., дваранскія і клерыкальныя гісторыкі, буржуазная гістарыяграфія), беларуская савецкая гістарыяграфія ў даваенны перыяд (агульныя працы па гісторыі Беларусі, работы па аграрнай гісторыі, сацыяльна-эканамічнай гісторыі гарадоў, палітычнай гісторыі і гісторыі культуры, развіццё гістарыяграфіі ў пасляваенныя гады (працы па аграрных адносінах, сялянскаму руху, прававому становішчу насельніцтва, гісторыі гарадоў, грамадска-палітычнаму жыццю і ідэйнай барацьбе).

Кніга З. Ю. Капыскага і В. У. Чапко дапамагае зразумець тэарэтычную пазіцыю і зыходныя прынцыпы дарэвалюцыйных гісторыкаў, савецкіх гісторыкаў 1920—1930-х гг., ацаніць уклад кожнага з іх у распрацоўку гісторыі Беларусі эпохі феадалізму.

На падставе глыбокага аналізу манаграфій па гісторыі Беларусі, якія выйшлі ў пасляваенныя гады, Капыскі і Чапко вызначылі іх галоўныя каштоўнасці: важнасць праблематыкі, глыбіню і фундаментальнасць асвятлення пытанняў, доказнасць высноў і абагульненняў, вялікую колькасць новага гістарычнага матэрыялу.

Ацэньваючы ў цэлым навуковую прадукцыю беларускіх гісторыкаў даваеннага перыяду, яны выдзелілі ў ёй галоўнае. На думку Капыскага і Чапко, прынцыпова важным з пункту гледжання метадалогіі было тое, што ў гэты час па-новаму прадстаў сам аб'ект даследавання. Гэта быў ужо не Паўночна-Заходні край з яго неакрэсленасцю гістарычных і этнічных межаў, а тэрыторыя Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

Праз 20 гадоў пасля выхаду сваёй манаграфіі аб эканамічным развіцці беларускіх гарадоў Зіновій Юльевіч выказаў важную думку. Яна заключаецца ў тым, што *«вследствие роста частновладельческих юридик в городах Беларуси не сложился сколько-нибудь прочный союз городов с верховной властью, и города не могли серьёзно влиять на политические судьбы государства»* [10, с. 134].

Зіновій Юльевіч быў адным з аўтараў манаграфій і кніг «Гісторыя Мінска» (Мінск, 1967), «История Белорусской ССР» (Т. 1. Минск, 1961», «Гісторыя Беларускай ССР» (Т. 1. Мінск, 1972), «Полацк: Гістарычны нарыс» (1962), «Гродно (исторический очерк) (совместно с Б. М. Фихом, 1964), «Гісторыя рабочага класа Беларускай ССР» (Т. 1. Мінск 1984), «Нарысы гісторыі Беларусі» (Ч. 1. Мінск, 1994).

У асабістай справе З. Ю. Капыскага, якая захоўваецца ў Цэнтральным навуковым архіве НАН Беларусі, маюцца характарыстыкі навуковай і грамадскай дзейнасці гэтага незвычайнага, выдатнага вучонага, у якіх падкрэсліваюцца яго вялікі ўклад у гістарычную навуку і станоўчая ацэнка яго шматлікіх навуковых прац.

Прывядзём радкі з характарыстыкі З. Ю. Капыскага, якая была адобрана на пасяджэнні сектара гісторыі Беларусі перыяду феадалізму 11 красавіка 1986 года:

«... Его основные научные интересы — история городов, историография и источниковедение Белоруссии в период развитого феодализма. Им опубликованы 4 монографии ... Всего опубликовано 94 работы, в том числе научных 56, объемом 71,2 п. л., научно-популярных 38, объемом 12,4 п. л. Является одним из составителей 7 сборников документов, редактором 5 монографий и членом редколлегии 11 научных трудов...

Опубликованная продукция получила положительную оценку научной общественности.

З. Ю. Копысский выступал с научными докладами на международной, двух всесоюзных, республиканской конференциях. Принимает активное участие в общественной жизни института, в течение ряда лет является руководителем семинаров в системе партийного просвещения (з 1945 года Зіновій Юльевіч быў членам КПСС. — *Э. І.*). Периодически выступал с лекциями перед населением» [4, л. 41—42].

У гэтай характарыстыцы адзначаецца, што ў 1981—1984 гг. пад навуковым кіраўніцтвам З. Ю. Капыскага было абаронена тры кандыдацкія дысертацыі.

Зіновій Юльевіч валодаў польскай, чэшскай і нямецкай мовамі.

Нельга не згадзіцца з наступнымі словамі аднаго з самых аўтарытэтных беларускіх гісторыкаў А. П. Грыцкевіча:

*«Шмат часу і сіл аддаў З. Капыскі навуковаму кіраўніцтву калектывамі даследчыкаў і рэдагаванню кніг, што былі падрыхтаваны ў Інстытуце гісторыі. Ён з'яўляецца не*

*толькі адным з аўтараў, але і рэдактарам 1-га тома пяцітомнай «Гісторыі Беларускай ССР», быў навуковым рэдактарам кніг «Полацк» (1962). «Гісторыі Мінска» (1967) і многіх інш. З. Капыскі з'яўляецца таксама аўтарам шматлікіх артыкулаў у Беларускай Савецкай Энцыклапедыі і Энцыклапедыі гісторыі Беларусі.*

*Шмат дапамагаў Зіновій Юльевіч сваім калегам. Яго дапамаога ў рэдагаванні навуковых прац і ў падрыхтоўцы кандыдацкіх дысертацыіі спрыяла навуковаму росту такіх вучоных, як У. Пасэ, Э. Іофе, М. Батвінік, М. Спрыдонаў і інш. З. Капыскі (разам з А. Карпачовым) шмат дапамагаў у падрыхтоўцы тэкстаў кандыдацкай і доктарскай дысертацый В. Мялешкі. Многія іншыя гісторыкі, у тым ліку і аўтар гэтых радкоў, з удзячнасцю ўспамінаюць добрыя навуковыя парады Зіновія Юльевіча Капыскага»* [7, с. 195].

З. Ю. Капыскі стварыў сваю навуковую школу, да якой належыць і аўтар гэтых радкоў. Пад навуковым кіраўніцтвам Зіновія Юльевіча я ў 1975 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «В. И. Пичета как историк социально-экномического развития Белоруссии — первой половины XVII века».

Праз 18 гадоў — у 1993 г. З. Ю. Капыскі стане афіцыйным апанентам пры абароне маёй доктарскай дысертацыі «Советская историография социально-экономического развития белорусской деревни середины XVII — первой половины XIX века».

Зіновій Юльевіч ніколі не забываў сваіх настаўнікаў, асабліва беларускага гісторыка і грамадскага дзеяча, акадэміка АН БССР, акадэміка — сакратара аддзялення грамадскіх навук АН БССР, заслужанага дзеяча навукі БССР, доктара гістарычных навук, прафесара У. М. Перцава. На першай старонцы сваёй самай вядомай працы «Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в.» перад прадмовай «От автора» ён напісаў:

*«Памяти учителя Владимира Николаевича Перцева посвящается».*

Капыскі вельмі паважаў супрацоўнікаў архіваў і бібліятэк, у якіх ён працаваў. На аўтарэфераце яго доктарскай дысертацыі «Города Белоруссии во второй половине XVI — первой половине XVII в.» аўтар гэтых радкоў прачытаў такія словы:

*«Отделу редкой книги библиотеки АН БССР в знак глубокого уважения к энтузиазму, с каким создают его сотрудники, и с пожеланием им успехов в их очень важном и благородном деле*

*автор*

*13 / -68 Копысский (подпись)».*

Зіновій Юльевіч пражыў нялёгкае жыццё. Улада не песціла яго ўзнагародамі — не то што ордэнамі і медалямі, а нават простымі падзякамі. У асабістай справе вучонага захоўваецца цікавы дакумент. Гэта загад дырэктара Інстытута гісторыі аб падзяцы Капыскаму. Прывядзём яго тэкст:

*«АКАДЕМИЯ НАУК БЕЛОРУССКОЙ ССР*

*ИНСТИТУТ ИСТОРИИ*

*16 января 1986 г.* *ПРИКАЗ* *№ 6-К*

*г. Минск*

*За многолетнюю, добросовестную работу. Активное участие в общественной жизни коллектива и в связи с 70-летием со дня рождения старшему научному сотруднику-консультанту сектора истории Белоруссии периода феодализма КОПЫССКОМУ ЗИНОВИЮ ЮЛЬЕВИЧУ объявить благодарность.*

*Директор Института* *П. Т. Петриков»* [4, л. 38]

Вось як кіраўніцтва Інстытута гісторыі АН БССР адзначыла заслугі вучонага-гісторыка з еўрапейскім імем, які к таму часу ўжо 36 гадоў добрасумленна працаваў на ніве гістарычнай навукі і ствараў славу гэтай навуковай установе.

Капыскаму давялося зазнаць на сабе праяўленні палітыкі дзяржаўнага антысемітызму, якая доўгія гады праводзілася ў СССР.

Калі дырэктар Інстытута гісторыі АН БССР Н. В. Каменская даверыла яму кіраўніцтва сектарам, то менш чым праз год новы дырэктар гэтага Інстытута І. М. Ігнаценка адразу ж пасля ўступлення на пасаду 21 кастрычніка 1969 г. «ліквідаваў» сектар З. Ю. Капыскага, у які ўваходзіла дзесяць чалавек, з такой фармулёўкай:

*«Упразднить созданный в конце 1968 г. сектор источниковедения и вспомогательных исторических дисциплин, использовав научных сотрудников сектора для разработки наиболее актуальных вопросов истории белорусского народа*

*И. о. зав. сектором З. Ю. Копысского освободить от занимаемой должности, назначив его старшим научным сотрудником»* [4, л. 18].

Член-карэспандэнт АН БССР І. М. Ігнаценка выдатна ўсведамляў у той час важнасць сектара дапаможных гістарычных дысцыплін для беларускай гістарычнай навукі ў цэлым і Інстытута гісторыі АН БССР у прыватнасці, але яму не падабалася асоба выконваючага абавязкі гэтага сектара, асабліва пяты пункт асабовага лістка па ўліку кадраў. Аб гэтым аўтару гэтых радкоў гаварыў у свой час сам З. Ю. Капыскі.

Зіновій Юльевіч быў выдатным сем'янінам. Ён доўгія гады дружна пражыў з урачом Аленай Цімафееўнай Шубінай, якая была не толькі яго жонкай, але і надзейным сябрам, памочнікам і дарадцай. У гэтай сям'і нарадзіліся два сыны — у 1946 г. будучы фізік Яўген Зіноўевіч і ў 1950 г. будучы гісторык Барыс Зіноўевіч. Малодшы сын Барыс прадоўжыў справу яго бацькі і стаў таленавітым вучоным-гісторыкам, кандыдатам гістарычных навук, дацэнтам, загадчыкам аналітычнага аддзела Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, дарадцам міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь, прарэктарам Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка. У апошнія гады ён жыве ў Ізраілі. Беларускім гісторыкам стаў і сын Барыса, унук Зіновія Юльевіча

З. Ю. Капыскага не стала 14 снежня 1996 г. Ён не дажыў аднаго месяца да свайго 81-годдзя.

Істотны ўклад даследаванняў З. Ю. Капыскага ў беларускую гістарычную навуку, асабліва ў гісторыю беларускіх гарадоў у эпоху феадалізму, гістарыяграфію, крыніцазнаўства і археаграфію Беларусі, дастойны таго, каб імя гэтага вучонага назаўсёды засталося ў нашай памяці і было ўвекавечана ў Мінску і яго родным горадзе — Віцебску.

## Літаратура


1. Археографическии ежегодник за 1974 год. — М., 1975.
2. Весці АН БССР. Сер. грамад. нав. — 1986. — № 4.
3. Копысский, З. Ю. Источниковедение аграрной истории Белоруссии. — Минск, 1978. — 136 с.
4. Центральный научный архив НАН Беларуси. — Ф. 2. — Д. 2677.
5. Институт истории Национальной академии наук Беларуси (1929—2009) / А. А. Коваленя (рук.) [и др.]. — Минск: Беларус. навука, 2009. — 628 с.
6. Копысский, З. Ю. Экономическое развитие белорусских городов в XVI — первой половине XVII в. / З. Ю. Копысский. — Минск. 1966. — 227 с..
7. Грыцкевіч, А. З. Ю. Капыскі — даследчык гісторыі Беларускай мінуўшчыны / А. Грыцкевіч // Беларускі гістарычны часопіс. — 1996. — № 1.

8. Копысский, З. Ю. Города Белоруссии в XVI — первой половине XVII в. Автореферат диссертации на соискание ученой степени доктора исторических наук / З. Ю. Копысский. — Минск, 1967.
9. Советское славяноведение. 1986 № 4.
10. Копысский, З. Ю. Историография БССР: эпоха феодализма / З. Ю. Копысский, В. В. Чепко. — Минск: Университетское, 1986. — 172 с.

—◊—

***А. Г. Каханоўска***

## СЛОВА ПРА БАЦЬКУ

*(да 80-годдзя з дня нараджэння Генадзя Аляксандравіча Каханоўскага)*

8 студзеня 2016 г. споўнілася б 80 год з дня нараджэння майго бацькі — Генадзя Аляксандравіча Каханоўскага, доктара гістарычных навук, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, старшыні Беларускага краязнаўчага таварыства, чалавека, які ўсё сваё жыццё аддаў вывучэнню і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Ён заўчасна памёр на 59-м годзе жыцця 15 студзеня 1994 г. ад невылечнай хваробы. Час праходзіць, але боль страты для сям'і, блізкіх не знікае. Вельмі часта ў мяне асабіста ўзнікае думка, што не ўсё спытаў пры яго жыцці, не даведаўся многія дэталі сямейнага радаводу, не паглыбіўся ў прафесійныя сакрэты, проста не стае бацькоўскай парады.

Большая частка навуковай і творчай актыўнасці Генадзя Аляксандравіча Каханоўскага прыйшлася на час, калі празмерная цікавасць да гістарычнага мінулага Бацькаўшчыны, спробы адрадзіць яго нацыянальны каларыт, папулярызаваць народныя традыцыі, сапраўдны беларускі патрыятызм межавалі з абвінавачваннямі ў нацыяналізме. Тое, што не з'яўляецца чымсьці экстраардынарным сёння, калі ў сучаснай Беларусі ёсць магчымасць распрацоўваць любую з тэм айчыннай гісторыі і культуры, дэмакратычны падыход пры выбары іх, у той час нярэдка не ўпісвалася ў сістэму каардынат савецкага інтэрнацыянальнага падыходу. Хацелася б нізка схіліць галаву перад падзвіжніцтвам бацькі, многіх яго сяброў і сучаснікаў, якія правялі тытанічную працу ў архівасховішчах, бібліятэках, музейных запасніках Беларусі, Польшчы, Расіі, Украіны і іншых краін, у час палявых экспедыцый у вёсках і мястэчках Беларусі, выявілі і ўвялі ў навуковы зварот велізарны пласт матэрыялаў аб гісторыка-культурнай спадчыне Беларусі. Яны сваёй працай стварылі аснову, без якой немагчымай была б сёння рэстытуцыя нашых культурных каштоўнасцей, правядзенне многіх далейшых гістарычных даследаванняў.

У 1963 г. Генадзь Аляксандравіч Каханоўскі вярнуўся ў Беларусь пасля заканчэння Маскоўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя У. І. Леніна, нягледзячы на запрашэнне застацца прадоўжыць вучобу ў аспірантуры. Працаваў настаўнікам у Маладзечне, пазней перайшоў на працу ў Мінскі абласны краязнаўчы музей, які толькі пачынаў сваю дзейнасць. Прайшоў у музеі шлях ад навуковага супрацоўніка да дырэктара. У гэты перыяд сваёй дзейнасці зрабіў выключна шмат для арганізацыі краязнаўчай працы, вывучэння і папулярызацыі гісторыі роднай Маладзечаншчыны, суседніх раёнаў. Прайшоў сцяжынамі многіх мясцін, абследаваў сямейныя архівы нашчадкаў многіх нацыянальна-культурных двеячаў, зрабіў агульнавядомымі многія факты біяграфій Я. Купалы, М. Багдановіча, М. Чарота, А. Гурыновіча, Ф. Тапчэўскага і іншых. Сабраў у фондах музея значную колькасць рэдкіх выданняў і кніг, фрагменты слуцкіх паясоў, асабістыя рэчы М. К. Агінскага і многае іншае. Вынікам даследчыцкай працы стала выданне гістарычных нарысаў «Маладзечна» (1971), «Вілейка» (1974), «На запаветнай зямлі» (1974), сотняў артыкулаў у рэспубліканскіх і раённых часопісах і газетах. У 1979 г. у Вільнюсе абараніў кандыдацкую